**19.** Адпаведнікам устойлівага выраза з рускай мовы *мастер на все руки* ў беларускай мове з’яўляецца … .

**А)** на цікаўныя вочы парушынкі падаюць. **Б)** хоць вады напіся.
**В)** той не памыляецца, хто ад працы хіляецца.
**Г)** і кравец, і шавец, і на дудзе ігрэц.
**Д)** ні вокам не відаць, ні слыхам не чуваць.

**20.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ы***?

*1) др..вотня; 2) ябл..чны; 3) гл..ток;*
*4) бр..зент; 5) д..рыжабль; 6) д..рыжор.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3, 4, 6. **Г)** 2, 3. **Д)** 4, 5, 6.

**21.** Дадзены назоўнікі: *1) вечар; 2) нагор’е; 3) пад’ём; 4) галопам; 5) потым.* Якія словы маюць нулявы канчатак?

**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 3.
**Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**22.** У якіх словазлучэннях падкрэсленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні?

*1) саладжавая ўсмешка; 2) гарачае жаданне; 3) іскры надзеі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2.
**Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**23.** Да якога стылю адносіцца тэкст?

*Кроп пахучы – аднагадовая расліна. Сцябло прамастойнае, галінастае. Лісце рассечанае. Кветкі жоўтыя, суквецце – складаны парасон. Усе часткі расліны, асабліва насенне, багатыя на эфірны алей. Кроп ужываецца як прыправа да яды, пры кансерваванні агародніны.*

**А)** мастацкі. **Б)** гутарковы. **В)** публіцыстычны.
**Г)** навуковы. **Д)** афіцыйны.

**24.** *Невялікі апавядальны твор, які ў іншасказальным выглядзе заключае маральнае павучанне,* называецца … .

**А)** смяшынка. **Б)** анекдот. **В)** байка. **Г)** прытча. **Д)** балада.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 28000 экз. г. Мінск. 2013 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2013»

*Чацвер, 21 лютага 2013 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (8 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 8 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 8 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 24 балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 120;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 3-4 класаў

**1.** Беларускі “*горад солі*” – … .

**А)** Добруш. **Б)** Салігорск. **В)** Кобрын. **Г)** Гарадзея. **Д)** Полацк.

**2.** У народзе гавораць: *“Паненка ў сямі сукенках”*. Пра якую расліну ідзе размова?

**А)** пра рэдзьку. **Б)** пра моркву. **В)** пра бурак.
**Г)** пра капусту. **Д)** пра бульбу.

**3.** Колькі ўсяго імён дзяўчынак (калі паўтараюцца, лічыць як адно імя) можна прачытаць у словах *маліна, піяніна*, паступова адкідаючы ў кожным слове па адной літары?

**А)** 2. **Б)** 3. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

**4.** Якое лексічнае значэнне адпавядае выразу:

*Калі мядзведзь у лесе, то скуры не дзяруць.*

**А)** распачатае трэба давесці да канца. **Б)** набрацца сіл.
**В)** заблудзіцца, збіцца з дарогі.
**Г)** перш чым што зрабіць, трэба падумаць.
**Д)** загадзя не зрабіўшы, не хваліся.

**5.** Вядомы ўсім *“рачны будаўнік”* (уключаны нават у спіс Міжнароднага саюза аховы прыроды) называецца … .

**А)** валун. **Б)** вір. **В)** бабёр. **Г)** кнігаўка. **Д)** акунь.

**6.** Назоўнікі *няўдача*, *фіяска* з’яўляюцца … .

**А)** сінонімамі. **Б)** антонімамі. **В)** амонімамі. **Г)** паронімамі. **Д)** амафонамі.

**7.** Выберыце правільна напісаную прыказку.

**А)** Госць першы тыдзень – жалеза, другі – волава, а трэці – медзь, хоць дадому едзь.

**Б)** Госць першы тыдзень – золата, другі – волава, а трэці – медзь, хоць дадому едзь.

**В)** Госць першы тыдзень – серабро, другі – золата, а трэці – медзь, хоць дадому едзь.

**Г)** Госць першы тыдзень – золата, другі – серабро, а трэці – медзь, хоць дадому едзь.

**Д)** Госць першы тыдзень – золата, другі – серабро, а трэці – нічога не есць, хоць дадому едзь.

**8.** Выберыце з прапанаваных словы, якія маюць шэсць гукаў:

*1) шчаўе; 2) кур’ёз; 3) льецца; 4) акіян; 5) калоссе; 6) сняжок.*

**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 3. **В)** 1, 3, 6. **Г)** 2, 3, 5. **Д)** 4, 5, 6.

**9.** *Самае шаноўнае і сімвалічна значнае месца ў традыцыйнай хаце* здаўна называлася … .

**А)** талака. **Б)** кут. **В)** рэч. **Г)** лаўка. **Д)** стол.

**10.** У якіх словах з прыведзеных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***л***?

*1) шо..к; 2) во..к; 3) па..ка; 4) сея..ка; 5) шчо..кнуць; 6) памы..ка.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1, 2.
**Г)** 2, 3, 5, 6. **Д)** 3, 4, 6.

**11.** Разгадайце загадку:

*Яна галодная – хата халодная,*
*Яна пад’ела – хата пацяплела.*

**А)** гаспадыня. **Б)** пліта. **В)** печ. **Г)** карова. **Д)** каза.

**12.** *Хата лесніка і яго сям’і* – гэта … .

**А)** леснікоўства. **Б)** лесніčоўка. **В)** лесасека. **Г)** прасека. **Д)** леспрамгас.

**13.** Дапоўніце выразы:

*1) дрыжыць, як …; 2) здаравенны, як …; 3) нахілілася, як … .*
*а) дуб; б) вярба; в) асіна; г) таполя.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-г, 2-а, 3-б. **В)** 1-в, 2-а, 3-б.
**Г)** 1-б, 2-г, 3-в. **Д)** 1-в, 2-б, 3-г.

**14.** Вучні атрымалі заданне выпісаць аднакаранёвыя словы. Сымон выпісаў *гарчыць, гарачы*; Алесь – *гімназіст, гімназічны*; Янка – *мараль, марафон*; Стас – *гарэлы, гарысты*. Хто з вучняў правільна выканаў заданне?

**А)** усе вучні. **Б)** Сымон. **В)** Алесь. **Г)** Янка. **Д)** Стас.

**15.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску неабходна напісаць літару ***ь***?

*1) гроз..ба; 2) падз..ме; 3) батал..ён; 4) зац..менне.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**16.** Прачытайце ўважліва верш Галіны Каржанеўскай “Два арэхі”. Падлічыце, колькі займеннікаў ужыта.

*Два арэхі-спарышы*
*Дамаўляліся ў цішы:*
*– Я пад ліст,*
*І ты пад ліст –*
*Едзе веласіпедыст.*
*Пахаваліся браты*
*Пад зялёныя лісты.*

*Хто ні ехаў,*
*Ні ішоў,*
*Іх папраўдзе не знайшоў.*
*А як стаўся дзень малым,*
*Разам крыкнулі:*
*– Ляцім!*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**17.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

*Заціхлі на полі камбайны – прыпынак* ***на абед****.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**18.** Вызначце правільна запісаны сказ з простай мовай.

**А)** “Чытай, мой унучак, – кожны дзень павучаў дзядуля малога, – Кнігі вучаць, як трэба жыць на свеце!”

**Б)** “Чытай, мой унучак,” – кожны дзень павучаў дзядуля малога. – Кнігі вучаць, як трэба жыць на свеце!

**В)** “Чытай, мой унучак, – кожны дзень павучаў дзядуля малога. – Кнігі вучаць, як трэба жыць на свеце!”

**Г)** “Чытай, мой унучак, – кожны дзень павучаў дзядуля малога: – Кнігі вучаць, як трэба жыць на свеце!”

**Д)** Чытай, мой унучак, – кожны дзень павучаў дзядуля малога. – Кнігі вучаць, як трэба жыць на свеце!